Правообладатель Пачатковая школа

Паслухайце оперны нумар. Якія сродкі музычнай выразнасці выкарыстаў кампазітар, каб перадаць настрой мамы Казы?

## Сустрэча мамы Казы з казлянятамі і Пеўнем

Паслухайце сцэну сустрэчы Казы з казлянятамі і Пеўнем. Які настрой перадае музыка? Якога музычнага «кіта» вы пазналі падчас слухання?



Уявіце сябе дырыжорамі. Дырыжыруйце нумарам пры яго паўторным слуханні.

Правообладатель Пачатковая школа

Спевакі з дзяцінства вучацца майстэрству спеваў, трэніруюць і ўмацоўваюць голас. А яшчэ вучацца дарыць сваім выкананнем радасць слухачам.



## Сонечны капеж

*Словы І. Вахрушавай* *Музыка С. Сасніна*






Правообладатель Пачатковая школа




2. Пляшут капельки-горошины,
и на мартовской проталинке
протянул ладошки к солнышку
голубой цветочек маленький.

**Прыпеў.**



3. И звенят сосульки весело,
и поёт капель весенняя.
Эта солнечная песенка —
нашим мамам поздравление.

? З якім настроем трэба выконваць песню? Як павінны гучаць вашы галасы? Падбярыце інструменты, якія дапамогуць передаць гук вясёлага капяжу.

Правообладатель Пачатковая школа

# МУЗЫЧНАЕ ПАДАРОЖЖА Ў КРАІНУ БАЛЕТ

**Балет** — музычны спектакль, гэтак сама як і опера. Але ў балеце змест перадаецца з дапамогай музыкі і танца. Кампазітар піша музыку, яе выконвае аркестр пад кіраўніцтвам дырыжора. Пастаноўкай танцаў займаецца *балетмайстар*. Танец складаецца з выразных рухаў і мімікі танцоўшчыкаў. І, зразумела, з іх здольнасці адчуваць музыку.

Артыстамі балета з'яўляюцца *балерыны*, *танцоўшчыкі* і *кардэбалет* (група танцораў).

Балетнаму майстэрству пачынаюць вучыцца з ранніх гадоў.



Салісты балета

Правообладатель Пачатковая школа



Кардэбалет

## Балет «Шчаўкунок»

*(фрагменты)*

*Музыка П. Чайкоўскага*

Балет створаны паводле казкі нямецкага пісьменніка Эрнста Гофмана «Шчаўкунок і Мышыны кароль».

*Час напярэдадні Новага года. Пушыстымі камякамі падае снег. Наступае пара казкі і чараўніцтва. На свята, насустрач невядомым падзеям і прыгодам, спяшаюцца шматлікія госці — дзеці і дарослыя…*

*Маша да свята атрымлівае вельмі дзіўны і незвычайны падарунак — ляльку Шчаўкунок. Смешна падскокваючы, лялька лузгае арэхі. Вось арэшак Машы, а вось Фрыцу…*

Правообладатель Пачатковая школа

## Марш

Пазнаёмцеся з музыкай марша. Уявіце, як пад гэту музыку крочаць па падарунку юныя госці. Выканайце пульс марша лёгкімі дотыкамі пальчыкаў да стала.



## Танец Феі Дражэ

Пазнаёмцеся з уладаркай ласункаў — Феяй Дражэ. Які інструмент выкарыстаў кампазітар, каб паказаць казачную гераіню? Пры паўторным слуханні звярніце ўвагу на тое, як музыканты здабываюць гук на струнных інструментах — смыком ці шчыпком (піцыката)?

Цікава, што менавіта ў балеце «Шчаўкунок» чалеста ўпершыню была ўключана ў склад сімфанічнага аркестра.

Правообладатель Пачатковая школа

## Вальс кветак

З якім музычным «кітом» вы сустрэліся ў гэтым балетным нумары? Якую карціну ўявілі падчас гучання музыкі?

Пры паўторным слуханні вальса паспрабуйце пачуць гучанне розных інструментаў. Раскажыце, як розныя тэмбры інструментаў дапамагаюць стварыць карціну танца кветак.

## Сняжынка-балерынка

Жила-была на свете
весёлая снежинка.
Кружил январский ветер
снежинку-балеринку.
С атласным белым бантом,
в крахмальной пелеринке
вставала на пуанты
снежинка-балеринка.
На освещённой сцене
снежинка танцевала,
и этот танец пеньем
метель сопровождала.

*Т. Шарыгіна*



Калі б вы былі кампазітарамі, якую музыку напісалі б для сняжынкі-балерынкі? Якім інструментам даручылі б выконваць мелодыю?

Правообладатель Пачатковая школа

# Балет «Маленькі прынц»
*(фрагменты)*

*Музыка Я. Глебава*



У аснове балета «Маленькі прынц» ляжыць твор французскага пісьменніка Антуана дэ Сент-Экзюпеpы.

Маленькі прынц жыве на сваёй планеце. Тут растуць карысныя і шкодныя расліны, ёсць злосныя баабабы. Калі іх своечасова не распазнаць, яны завалодаюць усёй планетай!

## Танец баабабаў



Падчас слухання музыкі перадайце яе характар з дапамогай выразных рухаў.

Правообладатель Пачатковая школа

На планеце Маленькага прынца жыве надзвычай прыгожая, але вельмі капрызлівая Ружа. Для Маленькага прынца яна — найвялікшы цуд.

## Адажыа Маленькага прынца і Ружы






На што падобна мелодыя адажыа: на песню, танец або марш? Перадайце характар мелодыі выразнымі рухамі рук.

**Адажыа** — павольны, лірычны танец двух герояў.

Мінае час — і Маленькі прынц выпраўляецца ў падарожжа па іншых планетах. На Зямлі ён трапляе ў сад руж. Спачатку прынц сумуе, заўважыўшы падабенства тысяч іншых кветак да яго Ружы. Але потым разумее: «Бачыць трэба сэрцам, а не вачыма». Яго Ружа адзіная і непаўторная.

Правообладатель Пачатковая школа

## Песня пра чароўную кветку

*Словы М. Пляцкоўскага* *Музыка Ю. Чычкова*

1. Есть на свете цветок алый, алый,
яркий, пламенный, будто заря,
самый солнечный и небывалый,
он мечтою зовётся не зря.

**Прыпеў:**

Может, там, за седьмым перевалом
вспыхнет свежий, как ветра глоток,
самый сказочный и небывалый,
самый волшебный цветок.
Ла-ла-ла-ла, ла-ла,
Па-па, па-па-пам...
Ла-ла-ла-ла, ла-ла,
Па-па-пам.
*2 разы*

2. В жизни хочется всем нам, пожалуй,
как бы путь ни был крут и далёк,
отыскать на земле небывалый,
самый-самый красивый цветок.

**Прыпеў.**

3. Вспоминая о радостном чуде,
вдаль шагая по звонкой росе,
тот цветок ищут многие люди,
но, конечно, находят не все.

**Прыпеў.**


Правообладатель Пачатковая школа

Паслухайце песню пра чароўную кветку. Якая па характары музыка песні (пяшчотная, ваяўнічая, жартаўлівая)? Гучанне якіх інструментаў вы пазналі?

Пры паўторным слуханні песні выканайце яе рытмічны малюнак. Паказвайце рытм лёгкімі ўдарамі кончыкаў пальцаў па стале. Прыпеў можна дапоўніць гучальнымі жэстамі.

Падзяліцеся на тры групы (партыі). Па ўказанні настаўніка-дырыжора выканайце наступны рытм:



Уявіце самую неверагодную, самую чароўную кветку. Паспрабуйце «пачуць» і праспяваць яе мелодыю.



Правообладатель Пачатковая школа

## Балет «Залаты ключык»

*(фрагменты)*

*Музыка А. Хадоскі*

Балет напісаны паводле казкі Аляксея Талстога «Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна». Галоўныя героі балета — Бураціна, Мальвіна, П’еро, Кот, Ліса, Карабас, Чарапаха.



### Танец Бураціна з залатымі





Якія карціны вы ўявілі падчас слухання? Які настрой героя перадае музыка? Ці застаецца ён нязменным на працягу ўсяго нумара? Гучанне якіх інструментаў сімфанічнага аркестра вы пазналі?



### Мальвіна





Правообладатель Пачатковая школа

Якой па характары паўстае Мальвіна (капрызлівай, строгай або пяшчотнай)? Ці адрозніваюцца вобразы гераіні ў казцы і ў балеце?

Які танец нагадвае музыка? Якія інструменты аркестра выконваюць сольныя партыі? Чаму, на ваш погляд, кампазітар даручыў выконваць тэму Мальвіны менавіта гэтым інструментам?

## Дуэт Ката і Лісы

Дуэт Ката і Лісы кампазітар стварыў на аснове танга. Танга — гэта парны танец з дакладным рытмам. Выконваецца надзвычай эмацыянальна.





Правообладатель Пачатковая школа

Разгледзьце нотны запіс дуэта. Прыгадайце вядомыя вам назвы нот і працягласцей. Ці можна выканаць гэтую мелодыю на маракасах? А на трохвугольніку? Якія групы інструментаў выконваюць гэтую музыку ў балеце?

## Песня таты Карла

*Словы Б. Акуджавы* *Музыка А. Рыбнікава*

1. Из пахучих завитушек,
стружек и колечек
мне помощником на старость
и на радость вам
скоро-скоро деревянный
выйдет человечек,
будет с кем мне под шарманку
топать по дворам.

2. Вот уже почти готов он —
добрый человечек,
я вложу в него надежду
и одежду дам.
Он спасёт нас от печали,
от нужды излечит,
будет с кем мне под шарманку
топать по дворам.

Пра што апавядаецца ў песні? З якім настроем яе трэба выконваць? Чаму кампазітар


Правообладатель Пачатковая школа



даў у нотах указанне выконваць песню «не спяшаючыся»? Як змяніцца характар музыкі, калі выканаць яе хутка ці вельмі хутка?

Прачытайце вершык.

— Куда спешишь ты, Буратино?
— На день рождения Мальвины.
— А что несёшь в подарок ей?
— Букетик радости своей.

*Т. Громава*

Якія героі казкі могуць удзельнічаць у дыялогу? Выберыце для выканання дыялогу два інструменты. Дапоўніце чытанне радкоў ігрой на патрэбным інструменце.

Правообладатель Пачатковая школа

# МУЗЫЧНАЕ ПАДАРОЖЖА Ў КРАІНУ СІМФОНІЮ

**Сімфонія** — буйны па памерах і глыбокі па сэнсе твор. Сімфонія складаецца з некалькіх частак, розных па характары. Іх музыка адрозніваецца тэмпам і іншымі сродкамі музычнай выразнасці. Выконвае сімфоніі сімфанічны аркестр.

## Сімфонія № 94 «Сюрпрыз»

*(фрагмент 2-й часткі)*

*Музыка Ё. Гайдна*

Сваю назву сімфонія атрымала дзякуючы музыцы другой часткі. Гэта частка выконваецца ў павольным тэмпе. Музыка будуецца на простай і выразнай мелодыі дзіцячай песенькі. Але расслабіцца пад яе ў слухачоў не атрымаецца!

Падумайце, чаму твор атрымаў такую назву.

Існуе легенда пра ўзнікненне назвы сімфоніі. Аднойчы кампазітар заўважыў, што публіка на канцэрце заснула. Ён вырашыў абудзіць слухачоў незвычайным чынам. Пасля ціхага гучання струнных інструментаў ён увёў грамавы акорд усяго аркестра, дадаўшы да яго гук літаўраў.


Правообладатель Пачатковая школа

**Літаўра** — інструмент ударнай групы аркестра.



? З дапамогай ілюстрацыі на с. 72 вызначце, дзе ў аркестры размяшчаюцца літаўры.

? Разгледзьце нотны запіс дзіцячай песенькі, якую Ёзэф Гайдн выкарыстаў у сімфоніі. Выканайце мелодыю па нотах разам з настаўнікам. Два такты спяваеце вы, два такты — настаўнік.




Навучыцеся спяваць мелодыю ціха.

Прыдумайце для выканання апошняга гуку «соль» свой «сюрпрыз».

Правообладатель Пачатковая школа

## Сімфонія № 94 «Сюрпрыз»

*(фрагмент 4-й часткі)*

*Музыка Ё. Гайдна*

Уявіце сябе дырыжорамі. Дырыжыруйце ўяўным аркестрам падчас гучання апошняй часткі сімфоніі. Паспрабуйце перадаць у сваіх рухах характар музыкі.

Якога музычнага «кіта» вы сустрэлі ў чацвёртай частцы сімфоніі: песню, танец або марш?

Падбярыце словы, якімі можна апісаць характар музыкі. У якім тэмпе (павольным, размераным ці хуткім) выконвае аркестр гэтую частку? Ці адрозніваюцца па тэмпе і характары чацвёртая і другая часткі сімфоніі?

## Мы дружим с музыкой

*Словы П. Сіняўскага* *Музыка Ё. Гайдна*





Правообладатель Пачатковая школа




**Клас.**
Музыка — это замок хрустальный,
музыка — это солнечный луч.

**Настаўнік.**
Мы открываем нотные тайны,
нам помогает в этом
мудрый скрипичный ключ.

Пра што спяваецца ў песні? Раскажыце, якую ролю адыгрывае музыка ў вашым жыцці, у жыцці вашай сям'і.

Навучыцеся выконваць песню разам з настаўнікам. Першую частку куплета выразна спявайце самі. Другую — слухайце ў выкананні настаўніка.

Падбярыце музычныя інструменты для вылучэння моцнай долі ў мелодыі. Выканайце песню з інструментальным суправаджэннем.

Правообладатель Пачатковая школа

# Сімфонія № 1

*(фрагмент 1-й часткі)*

*Музыка В.-А. Моцарта*

Вольфганг Амадэй Моцарт — геніяльны кампазітар. Ён напісаў сваю першую сімфонію ў восем гадоў.

У аркестры кожны інструмент выконвае сваю партыю. Усе яны запісаны ў **аркестравай партытуры.** Па ёй працуе дырыжор.






Правообладатель Пачатковая школа

Разгледзьце партытуру сімфоніі. Якія інструменты ўдзельнічаюць у яе выкананні? У якім тэмпе будзе гучаць музыка? З якой дынамікай пачнуць выкананне кожнай партыі музыканты?

Паслухайце фрагмент сімфоніі. Паспрабуйце пачуць гучанне розных інструментаў.

## Сімфонія № 40

*(фрагмент 1-й часткі)*

*Музыка В.-А. Моцарта*

Паслухайце адну з найбольш знакамітых сімфоній Моцарта. Яе музыка перадае чалавечыя пачуцці. Ужо з першых гукаў мы «чуем» усхваляванасць, трывогу. Мелодыю выконваюць скрыпкі, што надае музыцы асаблівую спеўнасць, мяккасць і цеплыню.

Параўнайце характар музыкі сімфоній № 1 і № 40. Якім колерам вы перадалі б настрой праслуханых фрагментаў?




Помнік В.-А. Моцарту ў Зальцбургу

Правообладатель Пачатковая школа

Акрамя буйных сімфанічных твораў, кампазітары пішуць **сімфаньеты.** Гэта маленькія сімфоніі. Яны ствараюцца для выканання не толькі сімфанічным аркестрам, але і іншымі калектывамі.

Беларускі кампазітар Мікалай Чуркін напісаў сімфаньету для аркестра народных інструментаў. У сваім творы ён выкарыстаў некалькі народных мелодый.

## Сімфаньета «Беларускія карцінкі»

*(фінал)*

*Музыка М. Чуркіна*

Апішыце музыку. Як змяняецца яе характар? Якія беларускія карцінкі «намалявала» музыка?

## Пайшоў Ясь наш на лужок

*Беларуская народная песня*

У сімфаньеце Мікалая Чуркіна гучыць мелодыя беларускай народнай песні «Пайшоў Ясь наш на лужок». Яна вельмі простая і лёгка запамінаецца. Кожны радок у песні паўтараецца двойчы.

Правообладатель Пачатковая школа



1. Пайшоў Ясь наш на лужок.
   Накасіў атавачкі ён стажок.
2. Пайшоў Ясь наш аддыхаць.
   І сваю Настулечку стаў чакаць.
3. А Настулечка не прыйшла,
   маці дома ёй работачку знайшла.

Развучыце песню і рытмічны акампанемент да яе. Падбярыце для рытмічнай партытуры музычныя інструменты або гучальныя жэсты. Навучыцеся выконваць песню з акампанементам у рухавым тэмпе.



Правообладатель Пачатковая школа

# МУЗЫЧНАЕ ПАДАРОЖЖА Ў КРАІНУ КАНЦЭРТ

Слова **«канцэрт»** мае некалькі значэнняў. Канцэртам называюць публічнае выкананне музычных твораў. А яшчэ канцэрт — гэта буйны музычны твор, у выкананні якога ўдзельнічаюць саліст і аркестр. Яны нібыта спаборнічаюць. Майстэрскай ігры саліста супрацьстаіць маляўнічае гучанне аркестра.

## Канцэрт для флейты з аркестрам «Шчыгляня»

*(1-я частка)*

*Музыка А. Вівальдзі*

Гучанне якіх інструментаў вы пазналі? Падумайце, чаму ў гэтага твора такая назва.

Да якой групы інструментаў належыць флейта? Апішыце яе тэмбр. Прыгадайце, у якіх творах вы ўжо чулі сола флейты.

## Ручай

*Пераклад з грузінскай А. Гурына*

*Музыка М. Парцхаладзэ*




Правообладатель Пачатковая школа




**2.** Шумно радуясь весне,
он спешит к морской волне.
Все, наверно, потому
уступают путь ему. } *2 разы*



**3.** Всё бежит, бежит ручей,
всё спешит, не спит ночей!
Песней, звоном хрусталя
будит рощи и поля. } *2 разы*

? Развучыце песню. Імкніцеся да лёгкасці ў яе выкананні.

Правообладатель Пачатковая школа

## Раніца вясною

Ціха ў полі, ціха ў лесе,
ані шэпне вецярок,
толькі дзесь у паднябессі
льецца звонкі галасок.

Як бы срэбраны званочак,
роніць ўніз за трэлем трэль,
аж заслухаўся гаёчак,
не парушыцца і ель.

Тонкіх хмарак валаконцы
сталі хараша ў радок,
як бы ўюць яны для сонца
з тых валоканцаў вянок.

Ціха ў полі, ціха ў лесе,
чуць балбоча ручаёк,
а высока ў паднябессі
льецца звонкі галасок.

*Я. Колас*



В. Бялыніцкі-Біруля.
«Вясновы пейзаж»

? Калі б вы былі кампазітарамі, якую музыку стварылі б да гэтага верша? Апішыце яе характар, тэмп, дынаміку. Якія інструменты ўдзельнічалі б у выкананні вашага твора?


Правообладатель Пачатковая школа

Кампазітары ствараюць канцэрты і для аркестра народных інструментаў. Іншы раз канцэрты пішуць для двух ці трох сольных інструментаў. Сольныя партыі ў канцэрце даручаюць выконваць вельмі прафесійным музыкантам. Пра іх кажуць — *віртуозы*.

## Канцэрт для дуэта цымбал з аркестрам

*(1-я частка)*

*Музыка Д. Камінскага*

Які настрой перадае музыка? Якія інструменты саліруюць у аркестры? Апішыце іх гучанне.

**Цымбалы** — незаменныя ўдзельнікі аркестра беларускіх народных інструментаў. Празрысты і звонкі гук гэтага інструмента надае гучанню аркестра асаблівую чароўнасць.

Цымбалы — гэта струнны інструмент. Іграюць на ім з дапамогай спецыяльных бразготак.



Цымбалы



Бразготкі

Правообладатель Пачатковая школа

Выканаўцаў на цымбалах называюць цымбалістамі.

Мелодыю якой знаёмай песні вы пачулі ў канцэрце Дзмітрыя Камінскага?

Прыгадайце беларускую народную песню «Саўка ды Грышка». Развучыце рытмічнае суправаджэнне да яе. Падбярыце для выканання акампанементу музычныя інструменты.

## Саўка ды Грышка

*Беларуская народная песня*
*(з рытмічным суправаджэннем)*




Правообладатель Пачатковая школа

Паглядзіце канцэртныя выступленні юных музыкантаў, напрыклад піяністаў або скрыпачоў. Падзяліцеся сваімі ўражаннямі ад прагляду.

Музыку для скрыпкі запісваюць на адным нотным стане:




А музыку для фартэпіяна запісваюць на двух нотных станах:




Як вы думаеце чаму?

Разгледзьце рытмічны запіс. Паспрабуйце выканаць рытм ударамі далоняў па стале.



Правообладатель Пачатковая школа

# ЯК СЯБРУЮЦЬ З МУЗЫКАЙ ІНШЫЯ ВІДЫ МАСТАЦТВА

Вы ўжо здагадаліся, што паводле аднаго сюжэта могуць быць створаны песня, танец, марш ці нават цэлыя спектаклі: опера, балет. Расказаць гісторыю могуць апавядальнік і інструменты сімфанічнага аркестра, як у сімфанічнай казцы Сяргея Пракоф’ева «Пеця і воўк».

Уявіце сябе кампазітарамі! Які музычны твор вы напісалі б паводле казкі Ханса Крысціяна Андэрсена «Дзюймовачка»?

?

**опера**

**балет**

**сімфанічная казка**

Складзіце план будучага твора. Вырашыце, якія героі будуць галоўнымі ў вашай музычнай гісторыі. Памятайце, што ў спектаклі могуць удзельнічаць не ўсе персанажы казкі. Могуць з’яўляцца і новыя героі.


Правообладатель Пачатковая школа



Дзюймовачка



Жанчына



Жук



Жаба



Палявая мыш



Крот



Ластаўка



Эльф

Які характар будзе ў кожнага персанажа? Якімі сродкамі выразнасці музыка перадасць гэты характар? Якую ролю ў гэтым адыграюць тэмбры інструментаў сімфанічнага аркестра? Ці будуць у вашым творы нумары маршавага характару?

Правообладатель Пачатковая школа

Як будуць узаемадзейнічаць героі вашага твора? Прадумайце сольныя і ансамблевыя нумары.






Раскажыце, якой сцэнай скончыцца ваша казка.


Правообладатель Пачатковая школа

# Вожык

*Словы В. Лукшы* *Музыка А. Чыркуна*






2. Не баюся я лісіцы,
не баюся я хітрыцы.
Востры зрок і тонкі слых.
Пых, пых, пых, пых, пых, пых, пых...

3. Ні ваўка і ні мядзведзя.
Што мне гэтыя суседзі?!
Ў норку — шась, смяюся з іх.
Пых, пых, пых, пых, пых, пых, пых...

Правообладатель Пачатковая школа

Як вы думаеце, чаму кампазітар пазначыў, што песню трэба выконваць стрымана? Якім нумарам магла б стаць гэтая песня ў оперным спектаклі? Пра што мог быць гэты спектакль?

Развучыце песню і рытмічнае суправаджэнне да яе. Колькі партый у рытмічным акампанеменце? Якія гучальныя жэсты або інструменты падыдуць да кожнай партыі?




Выканайце песню з рытмічным суправаджэннем.

У музычных спектаклях важную працу выконваюць мастакі. Гэта дэкаратары, касцюмеры, мастакі па асвятленні. Дзякуючы сяброўству музыкі і жывапісу спектаклі атрымліваюцца маляўнічымі і надоўга запамінаюцца гледачам.


Правообладатель Пачатковая школа

## Вальс. Поўнач

*(з балета «Папялушка»)*

*Музыка С. Пракоф'ева*



Уважліва паслухайце музыку. Які танец выконваюць Папялушка і Прынц? Як музыка паведамляе пра набліжэнне поўначы?

Прыгадайце, якія падзеі павінны адбыцца ў казцы, калі гадзіннік адлічыць 12 гадзін?

Уявіце, што вы дэкаратары спектакля. Раскажыце, як вы ўпрыгожыце сцэну. Якім вы пакажаце палац? Дзе змесціце гадзіннік? Ці спатрэбіцца вам карта?

## Марш Чарнамора

*(з оперы «Руслан і Людміла»)*

*Музыка М. Глінкі*

Опера Міхаіла Глінкі напісана паводле казкі Аляксандра Пушкіна «Руслан і Людміла».

Правообладатель Пачатковая школа

Злы чараўнік Чарнамор выкраў Людмілу і схаваў у сваім замку. Ён хоча спадабацца дзяўчыне. Апрануўшы багатае адзенне, у суправаджэнні слу́жак (ара́паў) ён ідзе да Людмілы.

Прачытайце, як гэта шэсце апісаў паэт.

Безмолвно, гордо выступая,
нагими саблями сверкая,
арапов длинный ряд идёт
попарно, чинно,
сколь возможно,
и на подушках осторожно
седую бо́роду несёт;
и входит с важностью за нею,
подъяв величественно шею,
горбатый карлик из дверей.
Его-то голове обритой,
высоким колпаком покрытой,
принадлежала борода.

*А. Пушкін*



Апішыце характар музыкі марша. Як музыка адлюстроўвае злога карліка? Што надае ёй казачны характар?

Уявіце сябе касцюмерамі. Намалюйце касцюм Чарнамора.


Правообладатель Пачатковая школа

## Акварыум

*(з сюіты «Карнавал жывёл»)*

*Музыка К. Сен-Санса*



У выкананні гэтага музычнага твора ўдзельнічае вельмі рэдкі інструмент — **шкляны гармонік.**





Апішыце гук гэтага інструмента. Як вы думаеце, чаму музыка п’есы «Акварыум» часта выкарыстоўваецца ў кіно? У чым сакрэт яе папулярнасці?

Музыка з’яўляецца важнай часткай мультфільмаў. Дзякуючы ёй гісторыі робяцца яшчэ больш захаплялньымі. У музыцы мультфільмаў мы можам сустрэць усіх трох «кітоў».

Правообладатель Пачатковая школа

## Музыка з мультфільма «Вандроўны замак»

*Музыка Д. Хісаісі*

«Вандроўны замак» — японскі мультфільм. Гэта казка пра чароўную сілу кахання.

Паслухайце музыку, якая неаднаразова гучыць у гэтым мультфільме. Апішыце яе характар. Якога «кіта» вы пазналі ў гучанні мелодыі і акампанементу?

## «Ничего на свете лучше нету»

*(з мультфільма «Брэменскія музыкі»)*

*Словы Ю. Энціна* *Музыка Г. Гладкова*



1. Ничего на свете лучше нету,
чем бродить друзьям по белу свету.
Тем, кто дружен, не страшны тревоги.
Нам любые до́роги доро́ги,
нам любые дороги дороги!


Правообладатель Пачатковая школа

2. Мы своё призванье не забудем:
смех и радость мы приносим людям.
Нам дворцов заманчивые своды
не заменят никогда свободы,
не заменят никогда свободы.

3. Наш ковёр — цветочная поляна.
Наши стены — сосны-великаны.
Наша крыша — небо голубое.
Наше счастье — жить такой судьбою,
наше счастье — жить такой судьбою!

Выканайце песню. З якім настроем яна спяваецца? Апішыце музычную мову песні: мелодыю, рытм, тэмп, дынаміку.

## «Ох, рано встаёт охрана»

*(з мультфільма «Брэменскія музыкі»)*

*Словы Ю. Энціна* *Музыка Г. Гладкова*



Почётна и завидна наша роль!
Не может без охранников король.
Когда идём, дрожит кругом земля.
Всегда мы подле, подле короля.
Ох, рано встаёт охрана!

Якія два «кіты» сустрэліся ў песні? Растлумачце свой адказ.

Прыгадайце любімыя песні з мультфільмаў. Выканайце іх.

Правообладатель Пачатковая школа

# КУДЫ ПРЫВЯЛІ НАС ПЕСНЯ, ТАНЕЦ, МАРШ

Песня, танец і марш — аснова ўсёй музыкі. Трох «кітоў» адразу мы сустракаем у буйных музычных творах — оперы, балеце, сімфоніі, канцэрце.

## Сімфанічная карціна «Тры цуды»

*(з оперы «Казка пра цара Салтана»)*

*Музыка М. Рымскага-Корсакава*

Рускі кампазітар Мікалай Рымскі-Корсакаў стварaў дзіўныя вобразы. Важную ролю ў яго операх адыгрываюць сімфанічныя эпізоды, якія выконвае аркестр. Сімфанічныя эпізоды дапаўняюць і ўпрыгожваюць оперныя спектаклі.

Опера «Казка пра цара Салтана» напісана паводле твора Аляксандра Пушкіна.

«Тры цуды» — вялікая маляўнічая карціна ў оперы. Пра з'яўленне кожнага новага цуду абвяшчае гучанне медных духавых інструментаў.

### Першы цуд

Ель растёт перед дворцом,
а под ней хрустальный дом;
белка там живёт ручная,
да затейница какая!


Правообладатель Пачатковая школа

Белка песенки поёт
да орешки всё грызёт.
А орешки не простые,
всё скорлупки золотые.
Ядра — чистый изумруд;
слуги белку стерегут.
Кучки равные кладёт
и с присвисточкой поёт
при честном, при всём народе:
«Во саду ли, в огороде».



**Не вельмі хутка**




Правообладатель Пачатковая школа

? У «Першым цудзе» гучыць мелодыя рускай народнай песні «Во саду ли, в огороде». Які інструмент яе выконвае? Як вы думаеце, чаму кампазітар даручыў выкананне менавіта гэтаму інструменту?

## Другі цуд



Море вздуется бурливо,
закипит, подымет вой,
хлынет нá берег пустой,
разольётся в шумном беге,
и очутятся на бреге,
в чешуе, как жар горя,
тридцать три богатыря,
все красавцы удалые,
великаны молодые,
все равны как на подбор,
с ними дядька Черномор.


Правообладатель Пачатковая школа

Які музычны «кіт» дапамагае «намаляваць» шэсце марскіх віцязяў? Як аркестр перадае шум бурлівага мора?

## Трэці цуд



За́ морем царевна есть,
что не можно глаз отвесть:
днём свет божий затмевает,
ночью землю освещает,
месяц под косой блестит,
а во лбу звезда горит.
А сама-то величава,
выступает, будто па́ва;
а как речь-то говорит,
словно реченька журчит.
Молвить можно справедливо,
это диво, так уж диво!

Перадайце характар музыкі «Трэцяга цуду» з дапамогай выразных рухаў. Якія рухі вы выкарыстаеце: задорныя і вясёлыя або няспешныя і плаўныя?

Якія інструменты аркестра дапамагаюць стварыць вобраз царэўны?

Правообладатель Пачатковая школа

У карціне «Царэўна-Лебедзь» мастак Міхаіл Урубель перадаў момант самога чараўніцтва — ператварэнне птушкі ў царэўну.

Пэндзлю мастака належыць не толькі карціна «Царэўна-Лебедзь». Ён стварыў дзіўныя дэкарацыі да оперы і эскізы касцюмаў.



М. Урубель. «Царэўна-Лебедзь»


Правообладатель Пачатковая школа

Прыгадайце, да якіх буйных музычных твораў прывялі нас песня, танец, марш.













Правообладатель Пачатковая школа

# АБАГУЛЬНЯЮЧЫ ЎРОК ПА ТЭМЕ «ПАДАРОЖЖА Ў МУЗЫЧНЫЯ КРАІНЫ — ОПЕРУ, БАЛЕТ, СІМФОНІЮ, КАНЦЭРТ»

1. Што вы ведаеце пра оперу? Хто ўдзельнічае ў выкананні оперы? Як называецца оперны нумар, які выконвае саліст? Прывядзіце прыклады вядомых вам опер і оперных нумароў.

2. Што такое балет? Чым падобны і чым адрозніваюцца балет і опера? Пералічыце вядомыя вам балеты і балетныя нумары.

3. У якіх двух асноўных значэннях ужываецца слова «канцэрт»? Назавіце кампазітараў, якія стваралі канцэрты для аркестра і сольных інструментаў.

4. Ці згодны вы з меркаваннем, што сольную партыю ў канцэрце можа выконваць любы інструмент? Дакажыце свой пункт погляду.

5. Што такое сімфонія і сімфаньета? Прыгадайце, з якіх асноўных груп інструментаў складаецца сімфанічны аркестр. Які інструмент з’яўляецца абавязковым удзельнікам аркестра беларускіх народных інструментаў?


Правообладатель Пачатковая школа

6. Што такое аркестравая партытура? Чыя праца ў аркестры немагчыма без апоры на партытуру?

7. У якім буйным музычным творы песня спяваецца, танец танцуецца, а марш маршыруецца?

8. Якія правілы паводзін трэба памятаць, калі знаходзішся ў тэатры?

9. На ўроках вы пазнаёміліся з рознымі музычнымі творамі. Якія з іх вам запомніліся больш за ўсё?

10. Якія музычныя творы сталі для вас любімымі?

**Да новых сустрэч з музыкай!**

Правообладатель Пачатковая школа

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Антология советской детской песни : песни для детей дошк. возраста. — Вып. 1 / сост. Л. Жарова, Л. Тихеева. — М. : Музыка, 1986. — 160 с.
2. Бетховен, Л. Песни для детей и юношества [Ноты] / Л. Бетховен ; сост. М. Андреева. — М. : Музыка, 1979. — 23 с.
3. Бракало, Н. И. Музыка : учеб. пособие для 2-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения : для работы в кл. / Н. И. Бракало, А. Б. Коженевская, В. А. Мистюк. — Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. — 148 с. : ил.
4. Весёлая карусель : песни из мультфильмов, телеспектаклей и радиопередач для детей. — Вып. 4. — М. : Музыка, 1981. — 24 с.
5. В стране чудес : песни из дет. телевиз. фильмов / сост. Л. Черницкая. — М. : Музыка, 1979. — 44 с.
6. Гуляева, Е. Г. Музыка : 1–4-й кл. : пример. календар.-темат. планирование : пособие для учителей учреждений общ. сред. образования / Е. Г. Гуляева, В. В. Ковалив, М. Б. Горбунова. — Минск : НИО : Аверсэв, 2018. — 93 с. — (Библиотека учителя).
7. Жабко, Я. Г. Усе поры года я вельмі чакаю : дапам. для педагогаў і муз. кіраўн. дашк. устаноў / Я. Г. Жабко. — Мінск : Выд. У. М. Скакун, 1999. — 144 с.
8. Ковалив, В. В. Бесконечные песенки / В. В. Ковалив. — Минск : Четыре четверти, 2005. — 64 с.
9. Ковалив, В. В. Где живёт музыка : пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения : с электрон. приложением / В. В. Ковалив. — Минск : Пачатковая школа, 2018. — 40 с. + 1 электрон. опт. диск (CD).
10. Ковалив, В. В. Музыка : 1–3-й кл. : дидакт. и диагност. материалы : пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / В. В. Ковалив, М. Б. Горбунова. — Минск : Пачатковая школа, 2018. — 64 с. : ил. — (Компетентностный подход).
11. Ковалив, В. В. Музыка : рабочая тетрадь : 2-й кл. : пособие для учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / В. В. Ковалив, А. Ю. Ковалив. — Минск : Пачатковая школа, 2018. — 40 с.



Правообладатель Пачатковая школа

12. Коваль, М. Волк и семеро козлят : дет. опера в 3 действиях ; либретто Е. Манучаровой / М. Коваль. — М. : НКП РСФСР, Центр. дом худож. воспитания детей, 1939. — 114 с.
13. Композитор Олег Ходоско [Электрон. ресурс]. — Режим доступа: https://vk.com/club108189147. — Дата доступа: 25.04.2019.
14. Красев, М. Петушок. Теремок. Муха-Цокотуха. Тим и Том : оперы-игры для детей мл. возраста / М. Красев. — М. : Музыка, 1970. — 98 с.
15. Металлиди, Ж. Сольфеджио : Мы играем, сочиняем и поём : учеб. пособие для 1-го кл. ДМШ : / Ж. Металлиди, А. Перцовская. — СПб. : Композитор, 2002. — 96 с.
16. Музыка : нот. хрест. : 2-й кл. : пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / сост. Н. И. Бракало, А. Б. Коженевская, В. А. Мистюк ; пер. с белорус. Т. В. Даниловой. — Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. — 148 с. : ил.
17. Музыкальный энциклопедический словарь / гл. ред. Г. В. Келдыш. — М. : Совет. энцикл., 1990. — 672 с. : ил.
18. Песенник 1981 [Ноты] : песенник для малышей / сост. Н. Вавилова. — М. : Музыка, 1981. — 24 с.
19. Песенный калейдоскоп : учеб.-метод. пособие / сост. С. М. Пацкевич. — Минск : БГПУ, 2006. — 83 с.
20. Праздник в школе : песни в сопровожд. баяна или аккордеона / сост., перелож. И. Зикса. — М. : Совет. композитор, 1998. — Вып. 1. — 64 с.
21. Улыбка : популяр. песни из дет. мультфильмов и телефильмов / перелож. для фп. Ю. Комалькова. — Вып. 2 / сост. Н. Матвеева. — М. : Совет. композитор, 1988. — 48 с. — (Библиотека пианиста-любителя).
22. Чайковский, П. Детский альбом / П. Чайковский, В. Лунин. — М. : Скорпион, 1994. — 136 с.
23. Чебурашка : песни и музыка из мультфильмов для малышей. — Вып. 2 / сост Е. Ботяров. — 1980. — 64 с.
24. Шорыгина, Т. Познавательные сказки : беседы с детьми о Земле и её жителях / Т. Шорыгина. — М. : Сфера, 2018. — 80 с.

Правообладатель Пачатковая школа

# ЗМЕСТ

## СРОДКІ МУЗЫЧНАЙ ВЫРАЗНАСЦІ

**Як кампазітары, выканаўцы і слухачы разумеюць адзін аднаго .................................. 4**

«Сумны сабака», «Крот-працаўнік», «У кузні», «Вятрак». *Музыка А. Безенсон* ........................ 5

Явар і каліна. *Словы Я. Купалы, музыка Ю. Семянякі* ........................................ 6

Гусанькі. *Словы С. Шушкевіча, музыка В. Каваліва* ........................................... 7

**Мелодыя — каралева музыкі ........................... 8**

Мелодыя. *Музыка Я. Глебава* ............................ 8

Карункі асеннія. *Словы і музыка Я. Жабко* ........................................ 11

До, рэ, мі, фа, соль. *Словы З. Пятрова, музыка А. Астроўскага* ..................................14

Вальс. *Музыка Я. Догі* .....................................15

**Рытм — залаты ключык музыкі .......................16**

Бульба. *Беларускі народны танец* ...................... 18

На арэлях. *Музыка Ф. Рыбіцкага* ...................... 18

«Взял волынку наш сосед». *Эстонская народная песня* ............................................ 19

Лявоніха. *Беларускі народны танец* ...................22

Вальс снежных камякоў (з балета «Шчаўкунок»). *Музыка П. Чайкоўскага* ..............22



Правообладатель Пачатковая школа

«Во поле берёза стояла». *Руская народная карагодная*........................................................22
Лезгінка. *Каўказскі народны танец*....................22
Кракадзіл і Чабурашка. *Словы і музыка І. Арсеева*..............................................23

**Тэмп у жыцці і ў музыцы................................. 24**

Драўляны конік. *Музыка Б. Дварыёнаса*........... 27
Каралеўскі марш ільвоў (з сюіты «Карнавал жывёл»). *Музыка К. Сен-Санса*........................ 27
Карусель. *Словы І. Рахілы, музыка Д. Кабалеўскага*........................................... 28
Спадарожная песня. *Словы Н. Кукальніка, музыка М. Глінкі*........................................... 29
Кастрычнік. Асенняя песня (з цыкла «Поры года»). *Музыка П. Чайкоўскага*......................... 30
Ліістапад. На тройцы (з цыкла «Поры года»). *Музыка П. Чайкоўскага*................................... 30
Венгерскі танец № 5. *Музыка І. Брамса*...........31
Вясёлыя падарожнікі. *Словы С. Міхалкова, музыка М. Старакадомскага*............................. 32

**Лад — гармонія, парадак паміж гукамі........... 34**

Раніца ў лесе. *Музыка В. Салманава*................ 36
Вечар. *Музыка В. Салманава*............................ 36
«Мама моя милая». *Словы С. Сардэчнай, музыка В. Каваліва*........................................... 37
Ляцелі гусёлкі. *Беларуская народная песня*..... 38

Правообладатель Пачатковая школа

Саўка ды Грышка. *Беларуская народная песня* ........ 39
Вясёлая. Сумная. *Музыка Л. Бетховена* ........ 40
Перапёлачка. *Беларуская народная песня* ........ 40
Вавёрачкі. *Словы Л. Някрасавай, музыка З. Левінай* ........ 41

**Сіла гуку (дынамічныя адценні)** ........ **42**
Бура. *Д. Хармс* ........ 43
Вечар. *Ф. Цютчаў* ........ 43
Гульня ў словы. *Словы А. Барто, музыка Д. Кабалеўскага* ........ 44
Ціха-гучна. *Словы і музыка І. Арсеева* ........ 45
Музычнае рэха. *Словы і музыка М. Андрэевай* ........ 46
Рэха ў гарах. *Музыка С. Майкапара* ........ 46
У пячоры горнага караля. *Музыка Э. Грыга* ........ 47
Полюшка. *Словы В. Гусева, музыка Л. Кніпера* ........ 48
Начавала ночка. *Словы У. Мазго, музыка В. Каваліва* ........ 49

**Рэгістр — краіна гукаў: высокіх, сярэдніх і нізкіх** ........ **50**
«Кто нам сейчас споёт?» *Словы і музыка В. Каваліва* ........ 51
Мядзведзь. *Музыка У. Рэбікава* ........ 52
Шэсце конікаў. *Музыка С. Пракоф'ева* ........ 52


Правообладатель Пачатковая школа

Матылёк. *Музыка С. Майкапара* ........................ 53
Зайчык дражніць медзведзяня.
*Музыка Д. Кабалеўскага* ................................ 53
Маё сонца. *Словы Д. Капура,*
*музыка Э. Капуа* ........................................ 54
«Растворил я окно». *Словы К. Раманава,*
*музыка П. Чайкоўскага* .................................. 54
Песня пра блыху. *Словы І. Гётэ (пераклад*
*А. Стругаўшчыкова), музыка М. Мусаргскага* ..... 54
Сурок. *Словы І. Гётэ (пераклад С. Спаскага),*
*музыка Л. Бетховена* ..................................... 55
Салавей. *Словы А. Дэльвіга,*
*музыка А. Аляб'ева* ....................................... 56
Серэнада. *Словы Л. Рэльштаба*
*(пераклад М. Агарова), музыка Ф. Шуберта* ..... 56
Глыбокая рака. *Афраамерыканская песня* ........ 56
Малінаўка. *Словы Г. Бюргера,*
*музыка Л. Бетховена* ..................................... 57

**Тэмбр — афарбоўка музычных галасоў .......... 58**
Палёт чмяля (з оперы «Казка пра цара
Салтана»). *Музыка М. Рымскага-Корсакава* ........ 58
Музыканты. *Словы Э. Агняцвет,*
*музыка А. Рамізоўскай* .................................. 59
Сімфанічная казка «Пеця і воўк».
*Музыка С. Пракоф'ева* ................................... 60
Вясковыя музыкі. *Музыка В. Помазава* ............ 62
Ваенны марш. *Музыка Г. Свірыдава* ................. 63

Правообладатель Пачатковая школа

Каляда, Каляда, дай, баба, пірага.
*Беларуская народная песня* ............................... 64
Ёлка-вясёлка. *Словы М. Чарняўскага,*
*музыка В. Каваліва*........................................... 65

**Абагульняючы ўрок па тэме**
**«Сродкі музычнай выразнасці»........................ 66**

## ПАДАРОЖЖА Ў МУЗЫЧНЫЯ КРАІНЫ — ОПЕРУ, БАЛЕТ, СІМФОНІЮ, КАНЦЭРТ

**Песня, танец, марш запрашаюць у падарожжа....68**
Марш драўляных салдацікаў (з «Дзіцячага
альбома»). *Музыка П. Чайкоўскага* .................. 68
Танец першай сняжынкі (з сюіты
«Поры года»). *Музыка В. Карэтнікава* ............. 69
Мядзведзеў сон. *Словы В. Жуковіча,*
*музыка Э. Зарыцкага*......................................... 70

**Інструменты сімфанічнага аркестра................. 72**
Сімфонія № 2 «Акіян» (фрагмент 1-й часткі).
*Музыка А. Рубінштэйна* .................................... 73
Песня пра дырыжора. *Словы*
*і музыка В. Каваліва* ......................................... 74
Люты. Масленіца (з цыкла «Поры года»).
*Музыка П. Чайкоўскага*..................................... 75
Полька «Трык-трак», «Піцыката-полька».
*Музыка І. Штрауса*............................................ 76


Правообладатель Пачатковая школа

Тэма чароўных ператварэнняў (з серыі фільмаў пра Гары Потара). *Музыка Д. Уільямса*...............78

**Музычнае падарожжа ў краіну Оперу**.............. **80**

Опера «Чароўная флейта» (фрагменты). *Музыка В.-А. Моцарта*....................................81

Арыя Царыцы ночы.......................................81

Дуэт Папагена і Папагены .............................. 82

Хор «Откуда приятный и нежный тот звон...» ................................................... 83

Опера «Муха-Цакатуха» (фрагменты). *Словы К. Чукоўскага, музыка М. Красева*......... 84

Песенька Мухі («Я Муха-Цокотуха...»)........... 84

Прылёт і песня Матылька ............................ 84

Хор гасцей................................................... 85

Песня Павука .............................................. 85

Песенька Мухі («Дорогие гости, помогите!..») ............................................. 86

Песенька Камара.......................................... 86

Заключны хор.............................................. 87

Опера «Воўк і сямёра казлянят» (фрагменты). *Словы Я. Манучаравай, музыка М. Каваля*...................................... 88

Песенька вясёлых казлянят.......................... 90

Песня Ваўка................................................ 92

Галашэнні Казы ........................................... 92

Сустрэча мамы Казы з казлянятамі і Пеўнем................................................... 93

Правообладатель Пачатковая школа

Сонечны капеж. *Слову І. Вахрушавай, музыка С. Сасніна* ........ 94

**Музычнае падарожжа ў краіну Балет** ........ **96**

Балет «Шчаўкунок» (фрагменты). *Музыка П. Чайкоўскага* ........ 97

Марш ........ 98

Танец Феі Дражэ ........ 98

Вальс кветак ........ 99

Сняжынка-балерынка. *Т. Шарыгіна* ........ 99

Балет «Маленькі прынц» (фрагменты). *Музыка Я. Глебава* ........ 100

Танец баабабаў ........ 100

Адажыа Маленькага прынца і Ружы ........ 101

Песня пра чароўную кветку. *Словы М. Пляцкоўскага, музыка Ю. Чычкова* ........ 102

Балет «Залаты ключык» (фрагменты). *Музыка А. Хадоскі* ........ 104

Танец Бураціна з залатымі ........ 104

Мальвіна ........ 104

Дуэт Ката і Лісы ........ 105

Песня таты Карла. *Словы Б. Акуджавы, музыка А. Рыбнікава* ........ 106

**Музычнае падарожжа ў краіну Сімфонію** ........ **108**

Сімфонія № 94 «Сюрпрыз» (фрагмент 2-й часткі). *Музыка Ё. Гайдна* ........ 108


Правообладатель Пачатковая школа

Сімфонія № 94 «Сюрпрыз» (фрагмент 4-й часткі). *Музыка Ё. Гайдна* ........................ 110
«Мы дружим с музыкой». *Словы П. Сіняўскага, музыка Ё. Гайдна* ..................... 110
Сімфонія № 1 (фрагмент 1-й часткі). *Музыка В.-А. Моцарта*................................. 112
Сімфонія № 40 (фрагмент 1-й часткі). *Музыка В.-А. Моцарта*................................. 113
Сімфаньета «Беларускія карцінкі» (фінал). *Музыка М. Чуркіна* .................................... 114
Пайшоў Ясь наш на лужок. *Беларуская народная песня* ........................................ 114

**Музычнае падарожжа ў краіну Канцэрт......... 116**

Канцэрт для флейты з аркестрам «Шчыгляня» (1-я частка). *Музыка А. Вівальдзі*................... 116
Ручай. *Пераклад з грузінскай А. Гурына, музыка М. Парцхаладзэ* ............................... 116
Раніца вясною. *Я. Колас*................................. 118
Канцэрт для дуэта цымбал з аркестрам (1-я частка). *Музыка Д. Камінскага* ................. 119
Саўка ды Грышка. *Беларуская народная песня (з рытмічным суправаджэннем)*............120

**Як сябруюць з музыкай іншыя віды мастацтва.................................................122**

Вожык. *Словы В. Лукшы, музыка А. Чыркуна*.......................................125

Правообладатель Пачатковая школа

Вальс. Поўнач (з балета «Папялушка»).
*Музыка С. Пракоф'ева* .......................................... 127
Марш Чарнамора (з оперы
«Руслан і Людміла»). *Музыка М. Глінкі* .............. 127
Акварыум (з сюіты «Карнавал жывёл»).
*Музыка К. Сен-Санса* ........................................... 129
Музыка з мультфільма «Вандроўны замак».
*Музыка Д. Хісаісі* ................................................. 130
«Ничего на свете лучше нету» (з мультфільма
«Брэменскія музыкі»). *Словы Ю. Энціна,*
*музыка Г. Гладкова* ............................................... 130
«Ох, рано встаёт охрана» (з мультфільма
«Брэменскія музыкі»). *Словы Ю. Энціна,*
*музыка Г. Гладкова* ............................................... 131

**Куды прывялі нас песня, танец, марш** ............. **132**
Сімфанічная карціна «Тры цуды»
(з оперы «Казка пра цара Салтана»).
*Музыка М. Рымскага-Корсакава* ......................... 132

**Абагульняючы ўрок па тэме**
**«Падарожжа ў музычныя краіны —**
**Оперу, Балет, Сімфонію, Канцэрт»** ................. **138**

Спіс выкарыстаных крыніц ................................... 140


Правообладатель Пачатковая школа

Вучэбнае выданне

КАВАЛІЎ Валянцін Васільевіч
ГАРБУНОВА Марыя Барысаўна

**МУЗЫКА**

Вучэбны дапаможнік для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Для работы ў класе

Рэдактар *А. І. Левіціна*
Мастакі *К. А. Шакаль, Ю. У. Пакіна, А. А. Левіцін, А. А. Ракава*
Нотаграфік *В. А. Дземідовіч*
Дызайн вокладкі *Ю. У. Пакінай*
Дызайн і вёрстка *А. А. Ракавай*
Карэктар *Т. В. Басалыга*

Падпісана да друку 10.06.2019. Фармат 70×100 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 12,35. Ул.-выд. арк. 6. Тыраж 8980 экз. Заказ 1205.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва “Пачатковая школа”».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/50 ад 08.10.2013.
Вул. Фабрыцыуса, 5, каб. 201, 220007, г. Мінск. Тэл./факс 233-99-34.
www.p-shkola.by; e-mail: psh@p-shkola.by.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск.

Правообладатель Пачатковая школа

(Назва і нумар установы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Правообладатель Пачатковая школа

ISBN 978-985-565-646-4

Правообладатель Пачатковая школа